пошуку; індывідуалізацыі заняткаў, варыятыўнасці, асобаснай скіраванасці зместу, сродкаў, форм, метадаў навучання; уключэння студэнтаў у прафесійна накіраваную творчую дзейнасць. Патрабуе практычнай апрабацыі ідэя стварэння аўтарскіх творчых лабараторый, майстэрань асобных выкладчыкаў для падрыхтоўкі будучых педагогаў-музыкантаў. У аснове гэтай ідэі — імкненне рэалізаваць на практыцы сістэму суб'ект-суб'ектных адносін, стварыць умовы самаразвіцця, прафесійна-педагагічнага самавызначэння студэнта.

Эфектыўнасць мастацка-педагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў залежыць перш за ўсё ад арыентацыі дзейнасці арганізатараў педагагічнага працэсу на канчатковую мэту, ад увасаблення ва універсітэцкім асяроддзі мадэлі будучай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ва ўсіх аспектах да спалучэння тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі студэнтаў на ўсіх этапах навучання. Таму такімі важнымі ўяўляюцца арганізацыя і правядзенне навуковых даследаванняў у вызначаных накірунках, аналіз і абагульненне вынікаў, шырокае ўкараненне іх у педагагічную практыку.

**Быстроў Г.А.,** дацэнт

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА ЯК СРОДАК ЯКАСНАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

Педагагічную практыку студэнтаў факультэта мастацкай творчасці звычайна разглядаюць у кантэксце агульнай прафесійнай падрыхтоўкі. Як базы практыкі пры гэтым выступаюць музычныя школы, харавыя студыі, агульнаадукацыйныя школы, школы з музычным, харавым, харэаграфічным ухілам, гімназіі, вучылішча мастацтваў, музычны ліцэй. За гады вучобы, час практыкі ў будучых выкладчыкаў фарміруюцца матывы педагагічнай дзейнасці, псіхалагічная да яе гатоўнасць.

Практыка студэнтаў па спецыялізацыі ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам педагога-кансультанта — спецыяліста дзіцячай музычнай педагогікі. Ён мае вопыт работы, клас навучэнцаў, і гэта спрыяе вырашэнню арганізацыйных пытанняў. Педагог-кансультант знаёміць практыкантаў з вучэбна-выхаваўчым працэсам, паказвае абсталяванне класаў, бібліятэкі. Яго практыканты наведваюць кантрольныя ўрокі, экзамены, конкурсы, канцэрты, справаздачы, іншыя мерапрыемствы творчага характару.

Студэнт-практыкант напярэдадні ўрока павінен прадставіць педагогу-кансультанту план яго правядзення. Штотыднёва педагог праводзіць кансультацыі з практыкантам, разглядае пытанні методыкі выкладання прадмета. Гэта забяспечвае добрую якасць урокаў і сувязь методыкі з практыкай.

Праграма педагагічнай практыкі па спецыялізацыі разлічана на 3 этапы, з 7 па 9 семестры: 7 семестр — з навучэнцамі 1 і 2 класаў музычнай школы, 8 семестр — з навучэнцамі 2 і 3 класаў, 9 семестр — з навучэнцамі 4 і 5 класаў. Практыкант павінен наведваць на кожным з этапаў не менш за 8 заняткаў у выкладчыкаў музычнай школы па спецінструменце. У гэтым заключаецца пасіўная практыка.

Індывідуальныя заняткі практыканта з вучнем падчас актыўнай практыкі праходзяць адзін раз на тыдзень, г.зн. не менш 10 заняткаў у семестр пад кіраўніцтвам педагога-кансультанта. Выпрацоўваць у навучэнца неабходныя выканальніцкія ўменні, навыкі трэба ў працэсе работы над рознымі па змесце, характары, стылі музычнымі творамі. Выхаванне і развіццё навучэнцаў заснаваны на вывучэнні народнай музыкі, творчасці сучасных кампазітараў, беларускіх, рускіх, заходніх музыкантаў-класікаў. На кожным з этапаў навучання ставяцца практычныя задачы, адбіраюцца адпаведныя метады, прыёмы, з дапамогай якіх яны вырашаюцца: паказ выканання на інструменце твора альбо фрагментаў; праца над інтанацыяй, вобразнасцю, зместам; выразнасцю інтэрпрэтацыі, характарам гучання; паказ-узор.

Эмацыянальна-вобразныя прыёмы азнаямлення з музыкай — гэта тлумачэнне і гутарка. Накіраванню пачуццяў, думак навучэнцаў спрыяюць пэўная ўстаноўка на ўспрыманне твора, а значыць, эмацыянальна-вобразная перадача сюжэта, выразнае чытанне педагогам тэксту твора, паказ танцавальнага руху, знаёмства з творамі жывапісу, што дапамагаюць засваенню твора. Устаноўку трэба рабіць сціслай, зразумелай, выразнай, вобразнай дзеля таго, каб вучні здолелі ярка ўявіць і эмацыянальна адгукнуцца на змест твора.

Фарміраванне ўменняў і навыкаў навучэнцаў праходзіць некалькі этапаў.

1. Методыка пачатковага слухання і развучвання твора. Пры гэтым выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы: сціслы эмацыянальны аповяд; выкананне, выразная інтэрпрэтацыя, якія выклікаюць эмацыянальны водгук; раскрыццё зместу, эмацыянальнага характару твора; гутарка, што складаецца з пытанняў педагога, адказаў вучня па змесце, мастацкіх вобразах, тэхнічных прыёмах выканання; паўторнае слуханне твора.

2. Методыка паглыбленага развучвання. Выкарыстоўваюцца такія прыёмы: наглядны паказ выканання частак твора; тлумачэнні, каментарыі, указанні ў працэсе развучвання, выкананне вылучаных фрагментаў твора для практыкавання; супастаўленне выканання мелодыі голасам і на інструменце.

Адбор практыкантам прыёмаў паглыбленага развучвання залежыць ад канкрэтных задач, складанасці рэпертуару, засвоенасці матэрыялу навучэнцамі. Правільнае творчае прымяненне іх актывізуе эмацыянальна-творчую дзейнасць навучэнцаў.

3. Методыка замацавання, удасканалення навыкаў. Тут ставіцца задача давесці набытыя навучэнцамі ўменні, навыкі выканання да стадыі самастойнага выканання ў рэальных умовах.

На першым этапе практыкант удзяляе ўвагу засваенню навучэнцамі пачатковых уменняў, навыкаў ігры на музычным інструменце. Адначасова адбываюцца назапашванне ўражанняў, узбагачэнне слыхавога вопыту, авалодванне тэарэтычнымі ведамі, замацаванне цікавасці да заняткаў музыкай. Навучэнец набывае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уменні працаваць самастойна, пісьменна і выразна выконваць эцюды, песні, танцы і інш.

На другім этапе ўдасканальваюцца атрыманыя практычныя ўменні, навыкі, паглыбляюцца музычныя веды студэнта. Ён грунтоўна знаёміць вучня з асноўнымі сродкамі выразнасці, жанрамі, формамі, фактурай твораў. Навучэнца падводзяць да разумення вобразнасці музычнага мастацтва. Выконваюцца заданні, практыкаванні па развіцці творчых уменняў, фарміраванні навыкаў ігры на слых, імправізацый.

На трэцім этапе практыкант вырашае пытанні, накіраваныя на рознабаковае развіццё навучэнца. У гэты перыяд фарміруюцца эмацыянальна свядомыя адносіны вучня да музыкі. У мэтах вырашэння выхаваўчых задач падбіраецца вучэбна-трэніровачны, мастацкі рэпертуар, музычна-выхаваўчая работа вядзецца згодна распрацаваным раней планам.

Кантроль за дзейнасцю практыканта, вядзеннем ім дзённіка ажыццяўляюць на працягу семестра кіраўнік практыкі, педагог-кансультант.

У канцы семестра студэнт-практыкант праводзіць адкрыты ўрок з навучэнцам і дэманструе вынікі працы. Адзнаку за гэты ўрок выстаўляюць кіраўнік практыкі і педагог-кансультант. На ўрок запрашаюцца педагогі музычнай школы, выкладчыкі кафедры.

Для абароны сваёй працы на кожным этапе педагагічнай практыкі студэнт павінен прадставіць камісіі:

— характарыстыку, напісаную кіраўніком практыкі;
— псіхолага-педагагічную характарыстыку вучня;
— аналіз індывідуальных заняткаў педагогаў музычнай школы па спецінструменце;
— дзённік практыкі;
— пратакол адкрытага ўрока з ацэнкай камісіі.

Паўрочны змест работы з вучнем павінен быць непасрэдна звязаны з паэтапнай праграмай. У пісьмовых выніках урока трэба ўказваць, што ж новага засвоіў вучань, што ён змог зрабіць самастойна, якія ўменні і навыкі атрымаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, удасканаленню практыкі садзейнічалі б наступныя меры.

Мастацкім кафедрам трэба паўней забяспечваць практыкантаў метадычнымі матэрыяламі, перш за ўсё праграмамі педагагічнай практыкі па спецыялізацыі.

Трэба сканцэнтраваць праходжанне педагагічнай практыкі студэнтаў кожнай з мастацкіх кафедраў на адной-дзвюх базах практыкі, дзе працавалі б пастаянна кіраўнікі ад базы і кафедры. Кіраўніцтва ад кафедры мэтазгодна засяродзіць у руках аднаго-двух выкладчыкаў. Гэта спрыяла б павышэнню адказнасці кіраўнікоў за якасць падрыхтоўкі практыкантаў. Неабходна надаваць больш увагі азнаямленню студэнтаў з планаваннем, авалоданню методыкай арганізацыі выхаваўчай работы на базах практыкі, умацаванню іх узаемасувязей. Лічым патрэбным абавязковае праходжанне педагагічнай практыкі студэнтамі 4 курса ў летнім аздараўленчым лагеры.

**Ушакова В.М.**, дацэнт

## СТАНАЎЛЕННЕ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА ПЕДАГОГА Ў СІСТЭМЕ ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Перыяд практычнага засваення педагагічнай прафесіі ў сістэме шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў дазваляе набываць дадатковую кваліфікацыю педагога ў пэўнай прафесійнай галіне. Мэтай у дадзеным выпадку з'яўляецца падрыхтоўка спецыяліста да самастойнай педагагічнай працы ў навучальнай установе.

Гэты перыяд дазваляе актывізаваць рэсурсы асобы ў авалодванні педагагічнымі інавацыямі. Значыць, ёсць магчымасць прафесійнага развіцця здольнасцей будучых спецыялістаў, станаўлення педагагічных стыляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ